

ШМАТГРАННЫ ЛІСТАПАД 5

ЮБІЛЕЙ МАЙСТРА 8




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

8 ЛІСТАПАДА 2022 г. АЎТОРАК № 219 (29841)


## КОРАТКА

- У Беларусі змяняюцца ліцэнзійныя патрабаванні да штата рыэлтарскай арганізацыі.
- **У краіне забаранілі продаж вадкіх супрацьгалалёдных рэагентаў пад выглядам незамярзаек.**
- Турэцкі акцёр Мустафа Віран Джэфа Кючукбайрак плануе зняць у Беларусі фільм-драму.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Валерый МІЦКЕВІЧ, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:**

*«Сёння ў Палаце прадстаўнікоў знаходзіцца на разглядзе праект Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці. Гэта вельмі важны дакумент, паколькі будаўнічая галіна з'яўляецца адной з найважнейшых у нас у краіне па ўсіх параметрах. Ад таго, наколькі будуць правільнымі, простымі і зразумелымі нормы, залежыць вельмі многае — пачынаючы ад якасці будаўніцтва, заканчваючы бяспекай. Цяпер максімальна важна дапрацаваць кодэкс. Спадзяёмся з улікам абмеркаванняў і кампетэнцый экспертаў унесці патрэбныя карэкціроўкі ў дакумент і ў выніку абмеркаванняў прыняць карысныя рашэнні. Мы прыцягнулі максімальную колькасць спецыялістаў і прафесіяналаў, якія спецыялізуюцца на будаўніцтве. Гэта зроблена для таго, каб выслухаць розныя пункты гледжання і намацаць шляхі ўдасканалення ў прававым рэгуляванні будаўнічай і архітэктурнай галіны».*


ISSN 1990 — 763X


З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Сёння справа ў нашых дзецях. Трэба пакінуць ім нармальную краіну»

### На чэмпіянаце па колцы дроў Прэзідэнт гаварыў аб вельмі сур'ёзных рэчах

**Учора супрацоўнікі беларускіх СМІ і прадстаўнікі блогер-супольнасці змаглі адзначыць дзень 7 лістапада так, як не адзначалі яшчэ ніколі. На беразе ракі Вячы, што ў Лагойскім раёне, адбыўся першы чэмпіянат па колцы дроў сярод журналістаў. Ідэйным натхняльнікам гэтага мерапрыемства стаў сам Прэзідэнт нашай краіны. Відэа, на якім Аляксандр Лукашэнка з памочнікам спрытна коле дровы і разважае пра тое, што беларусы гатовы імі падзяліцца з суседзямі, якія з-за ўласнай неразумнай санкцыйнай палітыкі маюць усе шанцы замерзнуць зімой, за некалькі гадзін стала надзвычай папулярным на прасторах інтэрнэту. Не толькі па колькасці праглядаў: многія беларусы падхапілі ідэю Прэзідэнта — у сеціве з'явіліся шматлікія відэа з тым, як людзі колюць дровы, пад хэштэгам, што заклікаў сагрэць кіраўніка суседняй краіны...**



«Потым чэленджы падхапілі журналісты нашага прэзідэнцкага пула. Усё нараджалася само сабой, і гэта самае галоўнае. Без перабольшання і без пафасу скажу: гэта беспрэцэдэнтны выпадак, мне здаецца, у сусветнай практыцы», — расказала гісторыю ўзнікнення падобнага роду спаборніцтва прэс-сакратар Прэзідэнта Наталля Эйсмант перад пачаткам чэмпіянату.

Яго ўдзельнікаў і гасцей чакаў прыемны сюрпрыз — на спаборніцтвы прыехаў сам кіраўнік Беларусі. Аляксандр Лукашэнка правёў майстар-клас, уласнаручна паказаўшы і патлумачыўшы, як правільна і хутка справіцца з пастаўленымі ўмовамі конкурсу задачамі. Па традыцыі згадаў ён і пра жыхароў суседніх краін, дзе зараз часам не ўсё проста з энергарэсурсамі. «Латышоў, літоўцаў і палякаў — да нас, няхай сякуць на дровы самі», — сказаў беларускі лідар. «Часы няпростыя. Трэба дапамагчы нашым людзям за межамі нашай краіны. Там нават людзі не могуць дровы купіць, а мы тут забаўляемся, жартам колем гэтыя дровы. Дай бог, каб не прапалі. Мы можам арганізаваць і падвесці да мяжы гэтыя дровы. Няхай літоўцы, латышы і палякі, украінцы ведаюць, што мы людзі мірныя, мы не хочам ніякай вайны. Мы гатовы разам паліць печку, смажыць шашлыкі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.



Фота БелТА.

Кіраўнік дзяржавы падзякаваў арганізатарам спаборніцтваў і ўдзельнікам за гэта свята. «Я часта пра гэта кажу: любая дзяржава моцная сваімі традыцыямі. Можа быць, сённяшняя наша сустрэча на прыродзе з гэтымі самымі моцнымі, дужымі людзьмі (а гэта перш за ўсё вяскоўцы і леснікі, гэта самыя моцныя людзі) надасць нам добры настрой і здароўе на доўгія гады», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

**Прэзідэнт паразмаўляў і з кіраўнікамі СМІ і журналістамі. У час нефармальнага дыялогу на імправізаваных табурэтках, зробленых з драўляных калод, кіраўнік дзяржавы адказаў на шэраг надзённых пытанняў. Размова стала своеасаблівай выязной сустрэчай «Клуба рэдактараў».**

### «МЫ ПАВІННЫ СТВАРЫЦЬ СІСТЭМУ»

Аляксандр Лукашэнка закрануў тэму Усебеларускага народнага сходу. Гэтаму органу, згодна з абноўленым Асноўным Законам, нададзены канстытуцыйны статус, а нядаўна прайшло грамадскае абмеркаванне закона аб УНС.


СТАР. 2




Фота БелТА.

Святочнае

# ПАДАРУНКІ — САБЕ І КРАІНЕ

**Беларусь захавала добрую традыцыю адзначаць 7 лістапада адкрыццём сацыяльна значных і важных для эканомікі аб'ектаў. Кіраўнік дзяржавы прызнаў, што адной з матывацый шанаваць свята ў гонар Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года была якраз звычка людзей да падобных падарункаў ад улады.**

**Штогод да гэтай даты ў краіне адкрываюцца новыя або абноўленыя аб'екты: ад мадэрнізаваных медыцынскіх кабінетаў да буйных прадпрыемстваў. Нашы карэспандэнты ў рэгіёнах распавядаюць пра сёлетнія падарункі.**


СТАР. 3

# «Сёння справа ў нашых дзецях. Трэба пакінуць ім нармальную краіну»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Кіраўнік дзяржавы адрэагаваў на некаторыя размовы вакол гэтай тэмы — аж да таго, што гэта робіцца нібыта для ўтрымання ўлады. «Слухайце, не ўва мне справа. Сёння справа ў нашых дзецях. Трэба пакінуць ім нармальную краіну», — сказаў ён.

Прэзідэнт пры гэтым канстатаваў, што і цяперашняя сістэма ў краіне нядрэнная і рабочая. Як прыклад — рэакцыя на перакосы ў сферы цэнаўтварэння. «Як нацiснуў зверху — уся вертыкаль улады выстраiлася. Ну так, нехта так, сяк, але выстраiлася ж. I не толькi вертыкаль улады. I суб'екты гаспадарання: i дзяржаўнай, i прыватнай формы ўласнасцi. Гэта дзеяннi ўлады. Нармальныя. Але яна не можа быць пастаяннай, статычнай. Яна павiнна ўдасканальвацца. I я гэта разумею. Не толькi таму, што бачу свет вакол. Я разумею, што нам трэба рухацца. Наогул, народ павiнен бачыць гэту «дзвiжуху», — заявiў Аляксандр Лукашэнка.

Кiраўнiк дзяржавы падкрэслiў, што ў тых цi iншых навацыях неабходна выходзiць з таго, што цяпер можна зрабiць як у эканомiцы, так i ў палiтыцы. Напрыклад, у Беларусi за гады незалежнасцi адбылося шэсць усебеларускiх народных сходаў — гэтых народных вечаў. «Чаму канстытуцыйным не зрабiць, чаму не ўзмацнiць яго ролю, чаму не слухаць там, на гэтым форуме, людзей? Не на вулiцы, а лепш там. Рухаемся», — прывёў ён прыклад.

Той самы падыход i ў эканомiцы. «Можам кiраваць прадпрыемствамi — кiруем. Не можам — давайце думаць. Аж да прыватызацыi, продажу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён акцэнтаваў увагу, што ў краiне ствараюцца i дзяржаўныя прадпрыемствы, i, як паказвае практыка, зусiм не заўсёды прыватнiк будзе працаваць лепш i больш эфектыўна. Адзiн з такiх прыкладаў — прадпрыемства ў Мёрах, у лёс якога прыйшлося ўмяшацца i кiраўнiку дзяржавы: «Выдатна працуе прадпрыемства. Калi можа дзяржаўнае прадпрыемства працаваць — няхай працуе. Не трэба думаць, што прыватнае — гэта святое. Так, ёсць людзi, якiя добра працуюць».

Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу, што ў Беларусi, у тым лiку i для прыватнага бiзнесу, значна прасцей атрымаць доступ да ўлады, каб абмеркаваць тыя цi iншыя праблемы, у адрозненне ад тых жа краiн Заходняй Еўропы. «Прыём грамадзян — анахранiзм Беларусi. Нiдзе яго нiхто не вядзе. Але мы такiм чынам чуем народ, людзей слухаем», — заўважыў кiраўнiк дзяржавы.

## «ЕЎРАПЕЙЦАМ ТРЭБА АЧОМАЦЦА I СПЫНIЦЬ ВАЙНУ»

Паразважаў Прэзiдэнт i пра тое, што адбываецца ў нашых суседзяў па кантыненце. «Германiя, уся Еўропа (гаворка пра Еўрасаюз. — «**Зв.**») — там няма кiраўнiкоў зараз. Калi б яны былi... Яны нават не могуць пытанне вырашыць па пажар ва ўласным доме, — сказаў беларускi лiдар. — Еўрапейцы не хочуць гэтай вайны. Яны ж разумеюць, што сёння ва Украiне. Тут Беларусь спрабуюць падпалiць. Успыхне заўтра ўся Еўропа».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што калi раптам успыхне новая сусветная вайна, то яна ж будзе праходзiць на тэрыторыi Амерыкi. «Амерыканцы, адзiнае, баяцца ядзернай зброi, бо туды можа прыляцець. Не будзе прыменена ядзерная зброя — значыць, будуць звычайнай зброяй ваяваць. Дзе? У нас будуць ваяваць. Мы тут будзем у гэтым катле. Украiна ўжо палае. Найбагацейшая. Няма такой краiны, як была Украiна. У савецкiя часы ўклалi столькi... А землi якiя, прырода якая! У што ператварылi? Катастрофа», — адзначыў кiраўнiк дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка лiчыць, што элiты шэрагу краiн у гэтай сiтуацыi не iмкнуцца спынiць канфлiкт, а, наадварот, спрабуюць дадаткова развязаць вайну дзеля захавання ўласнай улады. «Вайна ўсё спiша», — растлумачыў ён логiку дзеянняў шэрагу палiтыкаў.

«Еўрапейцам трэба ачомацца i спынiць вайну. А яны не могуць. Iм не даюць. Амерыканцы скарысталiся, — адзначыў Прэзiдэнт. — Няўжо гэта лiдары, якiя дазволiлi амерыканцам дадаткова завезцi туды ядзерную зброю? Гэта вар'яты».

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкi, кiраўнiкi ў ЕС поўнасцю залежныя ад ЗША. Больш за тое, у iх не хапае волi супрацьстаяць гэтаму цiску. Да гэтага дадаецца яшчэ i эканамiчная залежнасць ад паставак тавараў на прэмiяльны амерыканскi рынак, бiзнес-iнтарэсы. Тым не менш Прэзiдэнт Беларусi ўпэўнены, што, iдзi Еўрасаюз на партнёрскiя адносiны з Расiяй, гэта была б вялiкая сiла: «I нiхто б не перабiў. Рэсурсы — бяры не хачу, на тры пакаленнi хопiць. Тэхналогii — супертэхналогii. Не горш, чым у Амерыцы. «Давайце рабiць! А рашэнне прымаць няма каму. Баяцца. Часовыя людзi (ва ўладзе. — «**Зв.**»). Перасядзелi там тэрмiн-два... А заўтра пойдзем на iншую працу».

Аляксандр Лукашэнка лiчыць, што еўрапейцам трэба «галаву ў рукi браць i думаць, як жыць далей», бо вопыт, у тым лiку рэвалюцыi 1917 года, паказвае, да чаго можа прывесцi iгнараванне меркавання большасцi народа.

## «НАШУ АПАЗIЦЫЮ ТРЭБА ПЕСЦIЦЬ»

У Прэзiдэнта спыталi, што трэба рабiць i як сябе паводзiць, каб Беларусь i ў далейшым заставалася своеасаблiвым анклавам i ўзорам сацыяльна арыентаванай дзяржавы.

«Можна шмат пра гэта гаварыць. Але я заўсёды, размаўляючы з людзьмi, звяртаючыся да людзей, гавару: рабiце сваю справу. Вось самае галоўнае. Каб у нас нiколi не паўтарылася тое, што было ў 2020 годзе», — сказаў кiраўнiк дзяржавы.

Ён падкрэслiў, што зараз менавiта журналiсты знаходзяцца на пярэднiм краi: «Таму што галоўнае ў гэтым супрацьстаяннi — iнфармацыйная вайна, iнфармацыйнае супрацьстаянне. Таму галоўнае — вы зараз». Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што, вядома, цяпер няма гарачай вайны, але ад журналiстаў шмат залежыць. «Вы на пярэднiм краi. I я разам з вамi», — сказаў Прэзiдэнт. «Таму не трэба нiкога баяцца. Калi яны (апаненты. — «**Зв.**») пачынаюць вас атакаваць — значыць, зачапiлi. Калi яны пачынаюць на вас спасылацца, нешта казаць, добра, няхай спасылаюцца. У iх зараз трэнд такi: «Хлопцы, мы не фармiруем парадак дня, лукашэнкаўцы, ябацькi гэтыя што скажуць, а мы потым перапеўкамi займаемся». Ну, гэта так. Яны i не могуць фармiраваць. Як могуць яны фармiраваць? Таму яны вось i пайшлi (з заклiкамi. — «**Зв.**»): давайце ракетамi... Ну, гэта вар'яты. Калi б яны былi палiтыкамi, гэта казаць нельга, нават калi ты ў вар'яцкiм сне хочаш гэтага», — падкрэслiў беларускi лiдар.

«Ну хто сёння ў Беларусi за iмi пойдзе? Яны сябе ўжо апусцiлi нiжэй за плiнтус. Нельга такiя рэчы рабiць. Дзякуй богу, што яны такiя. Я ж кажу, што нашу апазiцыю трэба песцiць, гадаваць, палiваць, вадзiчкi... Няхай яна будзе i далей такая», — з доляй гумару заўважыў кiраўнiк дзяржавы.

**Паводле БелТА.**

**А чэмпiянат быў вельмi эмацыянальны i вiдовiшчны. Яго ўдзельнiкi (у тым лiку i жанчыны) спаборнiчалi, хто больш хутка i якасна расколе паленнi. Мужчыны таксама перасякалi бервяно. А фiнальнай кульмiнацыяй была эстафета, падчас якой каманды павiнны былi напiлаваць дроў, пасекчы iх i распалiць вогнiшча.**

**Галоўны прыз узяло агенцтва «Мiнская праўда». Акрамя каштоўных падарункаў ад арганiзатараў, журналiсты «Мiнскай праўды» атрымалi i спецыяльны падарунак ад Прэзiдэнта — сякеру з фiрмовай гравiроўкай.**





Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.





# САД, ДОМ, РЭНТГЕН-КАБІНЕТ, КРАМА

**У Магілёўскай вобласці да лістападаўскіх святочных дзён прымеркавалі ўвод шматкватэрнага дома ў аграгарадку Палыкавічы. Пяціпавярховік будаваўся ў дзве чаргі, цяпер здадзена ўжо другая — 80 кватэр, у тым ліку 60 для шматдзетных сем'яў Магілёўскага раёна. Жыллё пабудавана з дзяржпадтрымкай у рамках Указа Прэзідэнта № 240.**

— У раёне будзе пабудавана яшчэ два дамы для шматдзетных сем'яў агульнай колькасцю 79 кватэр, — удакладняе **дырэктар УКБ Магілёўскага раёна Дзмітрый ДАВЫДАЎ.** — Тэндэнцыя такая, што на працягу года ўсе шматдзетныя сем'і, якія маюць патрэбу ў жылле, яго атрымалі.

Падарунак для жыхароў абласнога цэнтра падрыхтавала магілёўская паліклініка № 9, якая абслугоўвае 25 000 жыхароў. Тут праведзена мадэрнізацыя рэнтгенкабінета на агульную суму 448 тысяч рублёў.

У Слаўгарадзе 7 лістапада адкрылася фірменная крама ад прадпрыемства «Чырвоны харчавік — Слаўгарад».

У рамках дабрачыннай рэспубліканскай акцыі «Сад надзеі» ў пятніцу ў аграгарадку Вендараж школьнікі садзжалі яблыні.

— Дзесяць пладовых дрэў было пасаджана нядаўна, калі школе прысвоілі ганаровае званне Героя Савецкага Саюза М. Раманькова, — паведаміла **начальнік аддзела па адукацыі Магілёўскага раёна Наталля КОЛАС.** —



Дом для шматдзетных сем'яў у аграгарадку Палыкавічы.

Яшчэ 35 пасадзілі тут напярэдадні свята Кастрычніцкай рэвалюцыі. Акцыю падтрымалі прадстаўнікі галоўнага ўпраўлення адукацыі Магілёўскага аблвыканкама на чале з начальнікам Андрэем Заблоцкім. Саджанцы перадала школе прыватнае прадпрыемства «Дусен». Плануем пасадзіць сады і каля іншых школ, а іх у раёне, акрамя гэтых, яшчэ 16.

Да свята ў Касцюковічах адкрыліся дзве дзіцячыя гульнявыя пляцоўкі на тэрыторыі санаторнага яслю-сада № 3 «Каласок».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ДАРОЖНЫ РУХ І СПОРТПЛЯЦОЎКА

**У Гродне ў цырымоніі адкрыцця аб'екта дарожнай інфраструктуры прыняў удзел прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА. Чырвоная стужка абвясціла аб пачатку паўнавартаснага руху па праспекце Касманаўтаў, новым участку будучай кальцавой, а таксама па двухузроўневай развязцы ў месцы перасячэння дарог.**

— У горадзе зроблена вельмі шмат для зручнасці і камфорту, — падкрэсліў падчас урачыстага адкрыцця Раман Галоўчанка. — Урад Беларусі па даручэнні Прэзідэнта ў поўным аб'ёме забяспечыў фінансаванне гэтага важнага аб'екта, зроблена ўсё для таго, каб ён быў пабудаваны якасна і ў вызначаныя тэрміны.

Таксама ў гэты дзень адкрылася пантонная пераправа для пешаходаў праз Нёман каля новага моста, які зараз закрыты на рамонт.

А вось для жыхароў Смаргоні важнай падзеяй стала адкрыццё новай футбольнай пляцоўкі каля дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы. Спартыўны аб'ект з'явіўся ў мікрараёне Карэні і стаў трэцім такога роду ў райцэнтры. Як зазначыў падчас адкрыцця **намеснік міністра спорту і турызму Алег АНДРЭЙЧАНКА,** раён паказвае прыклад у развіцці гэтай папулярнай гульні. Мужчынская каманда раёна амаль заваявала пуцёўку ў вышэйшы дывізіён Беларусі. Каманды дзяўчынак Смаргонскага раёна дастойна выглядаюць на ўзроўні зборных юніёрскіх каманд.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# МАСТЫ, ПАЖАРНАЯ ЧАСЦЬ, ДОМ ПРАВАСУДДЗЯ

**НА Віцебшчыне гэтымі днямі ўвялі ў строй адразу тры масты. У Мёрскім раёне падарункам жыхарам да Дня Кастрычніцкай рэвалюцыі стала 207-метровае аўтадарожнае збудаванне праз раку Авуту.**

У Наваполацку пасля глабальнай рэканструкцыі адкрылі Калінінскі мост, які з'яўляецца равеснікам горада-нафтавіка: будаўнічыя работы тут былі праведзены ўсяго за 17 месяцаў. На ўрачыстай цырымоніі адкрыцця важнага аб'екта Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзімір Андрэйчанка падкрэсліў, што адноўленая транспартная артэрыя, якая атрымала другое дыханне, стане яшчэ адной цаглінай у развіцці рэгіёна.

Напярэдадні свята жыхары гарпасёлка Сураж Віцебскага раёна таксама прайшліся па новым мосце праз раку Касплю. На яго рэканструкцыю са сродкаў абласнога бюджэту было накіравана каля сямі мільёнаў рублёў. Аб жыццёвай важнасці гэтага аб'екта суражане ведаюць не па чутках: мост у прамым сэнсе з'яўляецца адзінай пераправай, якая звязвае дзве часткі населенага пункта. Ва ўрачыстай абстаноўцы чырвоную стужку перарэзалі старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Цярэнцьеў, старшыня Віцебскага райвыканкама Генадзь Сабыніч, старшыня раённага Савета дэпутатаў Віктар Дарожкін з інжынерамі, адказнымі за новы аўтадарожны аб'ект.

Уваходзіны напярэдадні 7 лістапада справілі ратавальнікі горада Полацка: у новым мікрараёне «Аэрапорт» адкрылася пажарная аварыйна-ратавальная часць 4 Полацкага гаррайаддзела па надзвычайных сітуацыях. Аб'ект узведзены менш, чым за год.



Падчас адкрыцця дзіцячага дома сямейнага тыпу ў Гарадку.

У Гарадку адкрылі дзіцячы дом сямейнага тыпу, які стаў 32-і падобнай установай у паўночным рэгіёне.

Суды Чыгуначнага і Першамайскага раёнаў горада Віцебска атрымалі не толькі новую прапіску, але і ў пяць разоў павялічылі свае плошчы, аб'ект увялі ў эксплуатацыю датэрмінова. Старшыня Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь Валянцін Стукала падкрэсліў, што гэта трэці Дом правасуддзя, адкрыты ў краіне ў гэтым годзе.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

# І ШКОЛА МАСТАЦТВАЎ, І СПАРТЫЎНАЯ ЗАЛА

**На Міншчыне падарункам для жыхароў Стоўбцаў стала адкрыццё дзіцячай школы мастацтваў пасля рэканструкцыі будынка старой казармы.**

Як адзначыў **старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН** падчас урачыстай цырымоніі адкрыцця ўстановы, мастацтва садзейнічае гарманічнаму развіццю чалавека. На яго думку, такія школы павінны з'явіцца ва ўсіх раённых цэнтрах Міншчыны.

Увасабленнем мары стала і новая паліклініка ў аграгарадку Азярцо Мінскага раёна. Яна зможа прыняць 200 чалавек за змену. Установа аховы здароўя абсталявана па апошнім слове тэхнікі, будзе аказваць шырокі спектр паслуг для пацыентаў. Калі раней, напрыклад, жыхары Хацежынскага, Гаранскага сельсаветаў наведвалі паліклініку ў Бараўлянах, то цяпер ім хутчэй і зручней будзе дабірацца да Азярца.

Можна парадавацца і за жыхароў Старых Дарог. Год таму ў райцэнтры ўвялі ў дзеянне першую чаргу фізкультурна-аздараўленчага комплексу «Аква-Стар». Гэта сучасны басейн, трэнажорная зала, зала для фітнесу, більярдная...

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# ВАЖКІ ЎКЛАД У ХАРЧОВУЮ БЯСПЕКУ КРАІНЫ

**НА Брэстчыне напярэдадні свята адкрылі тры вытворчыя аб'екты: дзве малочнатаварныя фермы і новы цэх на мясакамбінаце.**

У аграгарадку Русінавічы СВК «Ляхавіцкі» Ляхавіцкага раёна ўведзена ў строй новая малочнатаварная ферма на 720 галоў дойнага статку. На ўрачыстае адкрыццё аб'екта запрасілі не толькі працаўнікоў гаспадаркі, але і студэнтаў Ляхавіцкага аграрнага каледжа. Звяртаючыся да іх, **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА** сказаў:

— Мы будуем гэта для вас. Увод у строй новай фермы накіраваны на павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці жывёлагадоўчай прадукцыі, а значыць, на далейшае развіццё гаспадаркі, якая і да гэтага радавала поспехамі.

Сімвалічны ключ ад новай фермы старшыні СВК Івану Вітко перадаў генеральны дырэктар ААТ «Пінсксаўгасбуд» Максім Красоўскі.

Гаспадары мяркуюць, што праект акупіцца за восем гадоў, а ўдой на карову складзе каля 9200 кілаграмаў у год.

Павіншаваў ляхавіцкіх аграрыяў з важнай падзеяй **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ.** Сенатар адзначыў, што ўвод у строй такіх высокатэхналагічных вытворчасцяў умацоўвае эканоміку краіны.

Тым часам у вёсцы Ганцавічы Камянецкага раёна адкрылі адну з самых буйных ферм у краіне. Гэта фабрыка малака належыць ААТ «Савушкіна пушча» і разлічана на ўтрыманне 1500 галоў буйной рагатай жывёлы. Варта сказаць, што гаспадарка за тры гады пабудавала два новыя малочнатаварныя комплексы.

У Кобрыне запушчаны новы цэх па выпуску каўбасных вырабаў. Інвестыцыйны праект рэалізавала прадпрыемства «Брэсцкія традыцыі» — філіял Брэсцкага мясакамбіната. Новы цэх разлічаны на выпуск 25 тон прадукцыі за змену. Тут створана каля паўсотні рабочых месцаў.

Усе адкрытыя вытворчасці Юрый Шулейка слушна назваў важкім укладам у харчовую бяспеку краіны.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**



Новая ферма ў вёсцы Ганцавічы Камянецкага раёна.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.



# ПУЦЕПРАВОД, ЛЯДОВАЯ АРЭНА, ФЕРМА

**НАЙВАЖНЕЙШАЯ транспартная артэрыя Гомеля — пуцеправод, які злучае мікрараён Гомсельмаш з Цэнтральным і Савецкім раёнамі абласнога цэнтра, — зноў адкрыта для руху. Аб'ект інфраструктуры, скончаны будаўнікамі са значным апярэджаннем тэрмінаў, стаў падарункам жыхарам Гомельшчыны да дзяржаўнага свята.**

— Для горада, дзе сутачны транспартны паток набліжаецца да 200 тысяч машын, — гэта стратэгічна важны аб'ект, — падзякаваў будаўнікам **старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО.**

Кіраўнік рэгіёна звярнуў увагу, якая вялікая работа была праведзена на Гомельшчыне мостабудаўнікамі толькі за апошнія гады. Знакавым аб'ектам стаў мост праз раку Прыпяць у Жыткавіцкім раёне, урачыста адкрыты ў 2018 годзе таксама да 7 лістапада Прэзідэнтам Беларусі. У 2019 годзе аднавіўся рух па мосце праз раку Сож у Гомельскім раёне. У мінулым годзе быў адкрыты мост праз Пціч у Акцябрскім раёне і ўнікальны вантавы мост праз Днепр у Рагачове.

— Найбліжэйшым часам завяршаем работы на мосце па аўтадарозе Пціч — Петрыкаў — Жыткавічы. Таксама ў планах гэтага года — абнаўленне моста праз раку Каўпіту ў Чачэрскім раёне. У Карманскім аднаўляем наплаўны мост праз Сож. У 2023 годзе мостабудаўнікі абяцаюць цалкам увесці пуцеправод у Калінкавіцкім раёне, — расказаў Іван Крупко.

Ёсць навіна ў развіцці рэгіянальнай спартыўнай прасторы. Падарунак жыхарам вобласці да Дня Кастрычніцкай рэвалюцыі — новая лядовая арэна ў Жлобіне. Будаўніцтва аб'екта пачалося ў 2013 годзе, але з-за дэфіцыту фінансавання было прыпынена. Аднавіліся работы па яго ўзвядзенні ў мінулым годзе. Адкрыццё арэны ў Жлобіне будзе садзейнічаць прыцягненню каманд з іншых гарадоў на трэніровачныя зборы.

Святочным падарункам для жыхароў Гомельшчыны гэтымі днямі таксама стаў і важны сельскагаспадарчы аб'ект. Новая малочнатаварная ферма на 600 галоў дойнага статка адкрылася ў філіяле «Дубрава-Агра» РУП «Гомельэнерга» ў вёсцы Зарэчча Светлагорскага раёна.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

Навінкі кнігавыдання

# ...У ЛЁСЕ АДЗІНАЙ БЕЛАРУСІ




**БелТА выдала адметную публіцыстычную кнігу вядомай у краіне журналісткі, заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь Аліны ГРЫШКЕВІЧ «Лёсы жанчын — лёс адзінай Беларусі». Пад адной вокладкай сабраны расповеды пра розных асоб, у кожнай з якіх свая вядомасць у грамадска-палітычным, сацыяльным, культурна-асветніцкім жыцці краіны.**

Адкрывае кнігу гутарка са Старшынёю Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталляй КАЧАНАВАЙ — «Жыццёвыя каштоўнасці, матчыны ўрокі і прыярытэты». Тым, хто прыходзіць у жыццё, робіць свае першыя крокі ў прафесіі альбо яшчэ толькі разважае, у якую ВНУ паступіць, варта асабліва ўважліва прачытаць адказы аўтарытэтнага палітыка і жанчыны, якая сваімі працоўнымі здзяйсненнямі даказала наяўнасць у нашай краіне шырокіх, роўных магчымасцяў для ўсіх, хто не шкадуе сіл у працы і за пункт адліку выбірае шчырае служэнне народу і краіне. Вось якімі пытаннем і адказам завяршаецца гутарка з Натальляй Качанавай: «— Назавіце, калі ласка, тры самыя важныя, з Вашага пункту гледжання, паняцці ў жыцці».

«Мір, спакой і любоў. Чым старэйшая станаўлюся, тым больш разумею: галоўнае — каб на зямлі, дзе ты жывеш, былі мір і спакой. І, вядома ж, важная любоў: трэба любіць дзяцей, родных, блізкіх. Любіць справу, якой займаешся, людзей, з якімі сустракаешся... Але без міру нічога гэтага не будзе».

Журналістка змагла выбраць гераінь сваіх інтэрв'ю і нарысаў так, каб паказаць нашу краіну праз лёсы яркіх жанчын, кожная з якіх не толькі прайшла праз розныя няпростыя выпрабаванні, але ў кожным лёсе — частка партрэта нашай роднай Беларусі. Як і ў лёсе жыхарак нарачанскай вёскі Шкленікова Марыі КУПРЭВІЧ і Тацяны ЧАРНЯЎСКАЙ. Пра іх і ўбачанае, перажытае імі, Аліна Грышкевіч расказвае ў нарысе «Дагэтуль у памяці папялішча і крыкі. Як склаліся лёсы жывых сведак нацысцкай расправы над Нарачу». Уражваюць, прымушаюць задумацца над даўнімі падзеямі Вялікай Айчыннай вайны і старонкі, прысвечаныя жыхарцы Гродна Валянціне Баранавай, — «Пайшла па бляце на фронт, брала Прагу. Гісторыя суперпазітыўнай 98-гадовай сібірачкі з Гродна». Увогуле, у кнізе шмат дзе прысутнічае Вялікая Айчынная вайна: і ў расповедзе пра Наталлю ІЛЬНІЦКУЮ («Як пасляховая бізнес-лэдзі з Брэста захоўвае памяць пра герояў вайны»), і ў нарысе пра галоўнага захавальніка фондаў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа, кандыдата сацыялагічных навук Васіліну МІЦКЕВІЧ («Сямейная дынастыя даўжынёй паўтара стагоддзя: пра музу Якуба Коласа і лёс яго праўнучак»).

«Роды з «каронай» і перакур цаною ў жыццё. Вядомы ўрач з Віцебска пра работу і асабістае» — Аліна Грышкевіч расказвае пра самаахвярную службу медыцыне, службу ў імя здароўя чалавека намесніка галоўнага ўрача па медыцынскай частцы Віцебскага абласнога клінічнага радзільнага дома Людмілу Адамаўну РОСЛІК.

Кніга «Лёсы жанчын — лёс адзінай Беларусі», якая выдадзена пры падтрымцы Пасольства Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь, а таксама ва ўзаемадзеянні з Таварыствам дружбы «Беларусь — Кітай», Беларускім таварыствам дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі, прыйшла да чытача адразу на чатырох мовах — беларускай, рускай, англійскай і кітайскай. Несумненна, выданне ўбачаць, прачытаюць і ў іншых краінах свету. І гэта дазволіць адчуць, зразумець сутнасць многіх складнікаў у будаўніцтве нашай краіне, зразумець значэнне і ролю жанчыны ў фарміраванні лёсу нашай Айчыны, вызначэнні яе духоўных, маральных прыярытэтаў.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

Па сутнасці

# Пачвары сучасных «рэвалюцый»



Народжаныя рэвалюцыяй. Вядомы выраз. У ім і рамантыка перамен, і цяжкі пануры настрой грамадства, у ім шырокія магчымасці і страчаная спадчына. Усяго хапае. Столькі часу прайшло, мы ў новым стагоддзі ў новых рэаліях. А адказ так і не знайшлі. У кожнага ён свой. Большасць сучаснага насельніцтва краіны вялікую частку свайго свядомага жыцця пражыла з тым пачуццём, што сёмае лістапада нават у шэрых савецкіх умовах заўжды ў каляндары пазначалася чырвоным колерам.

Хоць чаму шэрых? Што мы жыццё сваіх дзядоў і бацькоў так проста перафарбавалі ў шэры колер. Ці маем наогул права мы — тыя, каго ўжо не паспелі прыняць у акцябраты, — разважаць пра старэйшых? Журналісты — пісаць агідныя, брыдкія матэрыялы, рэжысёры — здымаць выкрывальныя стужкі, а псіхалагіні — абразліва тлумачыць пра забітасць і 50 адценняў шэрага савецкага побыту. Нават анекдот выдумалі. «Аўрора» — самая разбуральная зброя. Адзін стрэл — і 70 гадоў разрухі... Стоп, дык ужо 30 гадоў прайшло пасля таго, як кастрычнік перастаў быць Вялікім. І што? Што за палову гэтага перыяду пабудавалі? БАМ, новыя гарады сярод непралазнай тайгі альбо на поўначы? Мо ў нас ёсць Вялікая Перамога альбо падзея, суразмерная з палётам Гагарына? Мо нашы творцы стварылі велічныя мастацкія помнікі? Ці сучасныя будаўнікі змаглі паўтарыць ампір? Паўгалодны, замардаваны страшэннай вайной, акопамі, канцлагерамі, блакадай, акупацыяй савецкі чалавек-пераможца стварыў тое, што мы і цяпер выкарыстоўваем... Ну, прабачце: аб несвяточным, але надзвённым — аб ядзерным шчыце. Калі б не ён, з намі замест блакадных санкцый размаўлялі чэргамі з «Гепардаў». Добра, што Беларусь і беларусы не наступілі двойчы на адныя і тыя ж граблі. Я пра тое, што мы не адмовіліся ад савецкай спадчыны ў адрозненне ад суседзяў. Не сталі займацца контррэвалюцыяй. Не распачалі новую рэвалюцыю перабудовы. Вось такая памяркоўная палітыка маладога Прэзідэнта нас і выратавала.

Беларусы — не пра рэвалюцыю. Але сваю дзяржаўнасць мы дзякуючы чырвонаму сцягу ўсё ж такі атрымалі. У беларусаў да рэвалюцыі асаблівае стаўленне. Гэта дзень, калі ўдзячна ўспамінаем дасягненні пасляkастрычніцкіх падзей, але пры гэтым выразна падкрэсліваем: нам рэвалюцый хопіць.

Каб навучыць усіх чытаць Дастаеўскага, ці патрэбна было ўзрываць помнікі сярэднявечнага дойлідства? Каб хлопчыкі з маленечкіх хат пад саламянымі стрэхамі маглі паляцець у космас, ці патрэбна было вынішчаць эліту?

Ці былі тады іншаземныя інвестыцыі ў «пэрамэны»? Ці мо велізарную імперыю змаглі знішчыць толькі жыхары аседлых раёнаў і насельніцтва ва ўсіх сэнсах з цэмры Кранштата? Мабыць, палітычныя абставіны выкарысталі дэкаданс грамадскага духу. Як кажуць, зямля сама патрабавала помсты. Новыя эліты — буржуа — вырашылі змяніць карцінку па класічных французскіх рамансах. Стаміліся ад Раманавых. А змардаваныя сяляне і сапсаваныя ліберальнымі газеткамі завадчане стаміліся ад буржуа. Нават звычайны рускі салдат стаміўся сваёй крывёй паліваць пісьмовыя дагаворы саноўных асоб і вуліцы Еўропы.

На мой погляд, гэтае вогнішча перамен пастунова знішчыла б само сябе, бо ідэі Троцкага нагадвалі філасофію сучаснай глабалізацыі. Пад абломкамі зруйнаваных званіц хавалі Бога і традыцыі. У паленне для сусветнага полымя пераtваралі нашых продкаў.

А цяпер цікавая заўвага. Феномен бальшавіцкай рэвалюцыі. Толькі на глебе шырокага славянскага сэрца рэвалюцыйныя мары нямецкіх мудрацоў дайшлі да справядлівага фіналу. Усе сталі нібы роўныя, дзеці — сытымі, у хворых з'явілася магчымасць вылечыцца, і ў кожнага — рэалізавацца за кошт дзяржавы. У еўрапейскіх рэаліях рэвалюцыі знішчалі толькі манархіі. Уладароў, якія ў любым выпадку іх краіны, княствы ці імперыі лічылі асабістым домам. Затое да ўлады прыходзілі буржуа і бюргеры. Усе тыя ж эксплуататары простага чалавека. І ўсё, далей рэвалюцыйная ідэя буксавала. Пад лозунгам «свабода і братэрства» — звычайны капіталізм. А ці зараз інакш?

Інакш. Рэвалюцыі называюць «каляровымі». Каб адпавядаць мэйнстрыму эпохі постпраўды. Сутнасць адна і тая ж. Буржуазная. Праўда, зараз замест кампанэл летуценнікаў-мысляроў — прагматычныя паліттэхнолагі. Во пажартавалі! Нават і рэвалюцыі тыя з гумарам праводзяць. Два прытупы, тры прыплясы. І ўсё. Не дзяржава, а філіял транскарпацыі. Замест дзяржаўнай уласнасці — каршэрынгавая эканоміка. Замест моцнага неабыякавага кіраўніка — герой гумарыстычнага шоу, чарговая санду, затое з загадзя запраграмаваным рэйтынгам. Так я зараз праўёў і праводжу паралелі з 2020-м у Беларусі. А ці сапраўдны гаспадар жадае дрэннае сваёй хаце? Сапраўдны гаспадар ніколі не патрэбны дробнаму крамніку.

Сучасныя рэвалюцыі нараджаюць не Паўлаў Карчагіных. А касмапалітаў. Людзей без роду і племені. Без Айчыны і імя па бацьку. Без грамадзянства. Такімі зручней кіраваць.

Ізноў у геапалітычнай гульні нямецкая філасофская думка. Сучасны Маркс — гэта Шваб. Нашчадак прамыслоўцаў, сямейны кашалёк якіх занадта пацяжэў пасля Другой сусветнай. А сам Шваб лічыцца заснавальнікам Еўрапейскага форуму менеджараў. Зараз больш вядомы як Давоскі форум. Дарэчы, на гэтай пляцоўцы і Сусветная гандлёвая арганізацыя нарадзілася. Чалавек ён таленавіты і актыўны. Нават кансультатыўны савет ААН па ўстойлівым развіцці каардынаваў і ў «палітбюро» Бельдэрбергскага клуба ўваходзіў. Такая пляцоўка, дзе самыя, маўляў, галоўныя людзі планеты вырашаюць, як надалей жыць чалавецтву. Шваб з пляяды новых глабалістаў. Іх галоўная ідэя — зацвердзіць суверэнітэт рынкаў. Прыгожыя словы, не больш. А цяпер аб сэнсе. Мэта так званага «стэйкхолдарнага» капіталізму — каб прамыслоўцы і банкіры кіравалі дзяржаўнымі інстытутамі і былі акцёрамі глабальных змен. Ну, напрыклад, вядзе краіна пасляховыя баявыя дзеянні, а вось такі стэйкхолдар настойліва прапануе ўраду сесці за стол перагавораў.

Таму такія палітыкі, як Лукашэнка, для новых глабалістаў не пасуюць. Ім пасуе перазагрузка свету. Томас Кампанэла пры такім раскладзе — проста дзіця. Мара Шваба — «уберызацыя» працы. Вызваленне капіталу ад сацыяльных выдаткаў. Звычайная ідэалогія лібертарыянства. Толькі Шваб пайшоў далей. Светапогляд «дробнага крамніка» патрабуе сусветную эканоміку ператварыць у індустрыю чацвёртага пакалення. Калі замест інжынераў — камп'ютарны алгарытм, замест слесараў — робаты.

Дарэчы, да такіх «рэвалюцыйных» перамен чалавецтва наблізіў COVID-19. Па-першае, карантын на Захадзе знішчыў шмат асабістых бізнесаў. Транскарпарацыі сталі яшчэ больш уплывовымі. А ў ідэолага новых нармальнасцяў з'явіўся новы чарговы аргумент. Пандэміі патрабуюць «сістэмнага кіравання чалавечым існаваннем». Сістэмнага ў сэнсе глабальнага і сістэмнага ў сэнсе кіравання агульнай лічбавай сістэмай. То будзе новы — як у прымаўцы — цар, Бог і воінскі начальнік.

Далей кібаргізацыя, «разумныя тату», чыпіраванне — сімвалы чацвёртай ужо «прамысловай рэвалюцыі». Уся прамысловасць кіруецца глабальна. Цэнтр прыняцця рашэнняў адзіны. Ні палітыкаў, ні рабочых. Нават паэты больш не патрэбныя. Віртуальная рэальнасць. Надзеў акуляры — і атрымлівай асалоду. Віртуальную.

Але да гэтага чалавека трэба падрыхтаваць. Спачатку каб гаджэт стаў працягам твайго «я». Ізноў рэвалюцыя. Толькі без традыцыйнага чалавека. Рэвалюцыя свядомасці. Лічбавы неатрацкізм змывае межы не толькі дзяржаўныя, але і межы штодзённасці, рэчаіснасці, традыцый, маралі...

Але ж стоп. У Беларусі ліміт рэвалюцый вычарпаны. Пар гэта неаднаразова казаў наш Прэзідэнт. Розных рэвалюцый. Свядомасці, лічбавых, буржуазных, «каляровых». Была ў гісторыі адна Вялікая Кастрычніцкая. У гісторыі яе і пакінем. А астатнія ёсць каму спыніць.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Генеральны сакратар ААН папярэдзіў, што свет знаходзіцца на шляху ў «кліматычнае пекла»

Антоніу Гутэрыш заклікаў заключыць пакт кліматычнай салідарнасці, згодна з якім усе краіны будуць прыкладаць больш намаганняў для барацьбы з глабальным пацяпленнем, паведаміла Sky News. «Пакт, паводле якога ўсе краіны здзейсняць дадатковыя намаганні, каб скараціць выкіды ў гэтым дзесяцігоддзі і дамагчыся таго, каб пацяпленне склала не больш за 1,5 градуса Цэльсія. Пакт, паводле якога багатыя краіны і міжнародныя фінансавыя ўстановы акажуць фінансавую і тэхналагічную падтрымку, каб дапамагчы краінам, якія развіваюцца, паскорыць іх пераход на аднаўляльную энергію», — заявіў Гутэрыш, выступаючы на кліматычным саміце ў Шарм-эш-Шэйху. Генеральны сакратар ААН адзначыў, што колькасць шкодных выкідаў па ўсім свеце працягвае павялічвацца, а агульнасусветная тэмпература — расці. «Мы знаходзімся на шляху ў «кліматычнае пекла», і наша нага — на педалі газу», — заўважыў Гутэрыш.

### На Філіпінах шторм «Налджы» закрануў звыш 4,6 мільёна чалавек

Як паведаміла ТАСС са спасылкай на справаздачу Нацыянальнага савета па папярэджанні рызык і ліквідацыі стыхійных бедстваў, звыш мільёна перамешчаных асоб знаходзяцца ў 951 эвакуацыйным цэнтры. Загадзя пакінулі свае дамы больш чым 355 тысяч чалавек. Як мінімум 156 чалавек сталі ахвярамі шторму, 141 — траўміраваны, 37 лічацца прапаўшымі без вестак. Інцыдэнты, звязаныя са стыхіяй, адбыліся ў 13 рэгіёнах Філіпін. Шторм пашкодзіў 31,6 тысячы дамоў і знішчыў звыш 3,2 тыс. Нанесеную 800 інфраструктурным аб'ектам шкоду ацанілі ў 4,51 млрд песа (звыш $77 млн). Пашкоджанымі аказаліся 510 дарог і 120 мастоў, закрыта работа дзевяці аэрапортаў і 121 марскога порта. У 359 гарадах былі перабоі ў электразабеспячэнні. У многіх навучальных установах прыпынены заняткі, не працуюць 223 прадпрыемствы. У 522 гарадах аб'яўлены рэжым бедства.

### Амерыканскі касмічны карабель Cygnus стартаваў да МКС

Грузавы касмічны карабель Cygnus амерыканскай кампаніі Northrop Grumman стартаваў да Міжнароднай касмічнай станцыі (МКС). Аб гэтым паведаміла Нацыянальнае ўпраўленне ЗША па аэранаўтыцы і даследаванні касмічнай прасторы (NASA). Запуск быў ажыццёўлены з дапамогай ракеты-носьбіта Antares з касмадрома Уолапс, які размешчаны на аднайменным востраве каля атлантычнага ўзбярэжжа амерыканскага штата Вірджынія. Стыкоўка карабля Cygnus з МКС запланавана на 9 лістапада. Яна будзе ажыццёўлена шляхам захопу «грузавіка», які зблізіцца са станцыяй, дыстанцыйнай рукой-маніпулятарам МКС Canadarm-2 і наступным далучэннем яго да амерыканскага модуля Unity. Cygnus даставіць на МКС каля 3,7 тоны грузу, у тым ліку харчаванне, а таксама абсталяванне і матэрыялы для правядзення дзясяткаў навуковых даследаванняў.

МІНСКІ МІЖНАРОДНЫ КІНАФЕСТЫВАЛЬ ЛІСТАПАД

# ЯРКІЯ ФАРБЫ «ЛІСТАПАДА»

### Рэпартажы нашых карэспандэнтаў з Мінскага міжнароднага кінафестывалю

## Кіно — гэта пра каштоўнасці

**У кінатэатры «Масква» ў пятніцу ўвечары было шматлюдна, ужо на падыходзе да будынка стала зразумела: адбываецца нешта цікавае — гучала музыка, на экранах дэманстраваліся трэйлеры, а людзі каля ўвахода пыталіся аб лішніх білетах. Але ў гэты дзень «урваць» квіток — задача амаль немагчымая, бо ў кінатэатры зусім хутка пачнецца ўрачыстая цырымонія адкрыцця XXVIII Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад». Сёлета фестываль сабраў гасцей з Расіі, Кітая, Сербіі, Таджыкістана, Ізраіля. Таксама ў Мінск завіталі кіназоркі, сярод якіх Наталля Варлей і Дзмітрый Астрахан. Напярэдзе нас чакае шмат яскравых стужак, майстар-класы, творчыя сустрэчы і круглыя сталы. Фестываль — сапраўды знамянальная падзея ў культурным жыцці краіны — аб гэтым сказаў намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА, выступаючы на цырымоніі адкрыцця:**



— Мы спадзяёмся, што наш патрабавальны глядач, кінакрытыкі выберуць найлепшыя карціны, якія будуць затым дэманстравацца на прасторы краін, якія прымаюць удзел у «Лістападзе».

Традыцыйна ўрачыстая цырымонія адкрыцця распачалася з чырвонай дарожкі, па якой прайшлі ганаровыя госці і ўдзельнікі фестывалю. На самой цырымоніі адкрыцця намеснік прэм'ер-міністра зачытаў прывітальны адрас кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі ўдзельнікам фестывалю. У ім Прэзідэнт адзначыў, што форум працягне добрыя традыцыі па падтрымцы ідэалаў гуманізму, умацавання згоды і ўзаемапаразумення паміж народамі. У Год гістарычнай памяці яшчэ раз нагадае аб святых непарушных духоўных запаветах.

Падчас урачыстага адкрыцця «Лістапада» ганаровую ўзнагароду атрымаў **заслужаны дзеяч мастацтваў, кінарэжысёр і сцэнарыст Вячаслаў НІКІФАРАЎ.** Ён стаў лаўрэатам прэміі Прэзідэнта Беларусі «За захаванне і развіццё традыцый духоўнасці ў кінамастацтве»:

— Я на родным фестывалі. «Лістапад» нараджаўся ў Саюзе кінематаграфістаў у пачатку 90-х, калі я быў старшынёй. Ідэя належала Уладзіміру Рыбараву. Першай умовай было развіццё нацыянальнай кінематаграфіі. Другое — у фестывалю павінен быў быць міжнародны статус. Наша беларускае кіно — сапраўднае мастацтва, высокая паэзія. Наша літаратура ў асобе такіх светачаў, як Караткевіч, Быкаў, Адамовіч, Мележ, Дудараў, падарыла беларускаму кіно эпічны маштаб і чалавечнасць, — падзяліўся меркаваннямі кінарэжысёр.

Яшчэ адна прыгожая традыцыя, без якой не абыходзіцца ніводны «Лістапад», — талерка з аўтографамі ўдзельнікаў мінулага фестывалю, якую старшыня конкурсу разбівае на сцэне.

— Мы верым у тое, у што верылі, мы спадзяёмся на тое, на што спадзяваліся. Мы ведаем, што існуе любоў, мір, шчасце, вера ў Бога, у чалавечнае магчымасці, — адзначыў **народны артыст Беларусі Аляксандр ЯФРЭМАЎ**. — Нас шмат. Мы не альтэрнатыўны культурны працэс, мы сапраўдны культурны працэс. Мы адэпты сапраўднай культуры, і мяне гэта сагравае і радуе. Я спадзяюся, так будзе заўжды.

На цырымоніі адкрыцця ўпершыню была выканана песня «Лістапад» музычнага праекта «Зямля і неба». Таксама для ўдзельнікаў свята выступіў гурт «Верасы», а фінальным акордам стала выкананне ўрыўка з «Травіяты». Тэльман Гужэўскі, сябра журы конкурсу асноўнага кіно, які прыехаў да нас з Ізраіля, паўдзельнічаў у гэтым канцэртным нумары разам з салістамі Вялікага тэатра — Мартай Данусевіч і Дзмітрыем Шабецем.

Першы дзень «Лістапада» завяршыўся паказам стужкі «Плакаць нельга» расійскага рэжысёра Наталлі Назаравай. Фільм, які адкрыў XXVIII «Лістапад», распавядае аб рускай эмігрантцы ў Скандынавіі, сын якой не вярнуўся дамоў са школы.

## «Лістападзік» стартаваў з сусветнай прэм'еры

Услед за XXVIII Мінскім міжнародным кінафестывалем «Лістапад» распачаўся конкурс дзіцячых і юнацкіх фільмаў «Лістападзік». У гэтым годзе ў секцыі прадстаўлена дзевяць стужак: краінамі-ўдзельніцамі сталі Расія, Канада, Кітай, Турцыя і Казахстан. У конкурсе ёсць фільмы сацыяльнай накіраванасці, якія расказваюць аб экалагічных праблемах, закранаюць важныя тэмы для сучаснай моладзі. Многія з іх удзельнічалі і нават перамагалі ў буйных міжнародных фестывалях.



**Старшыня журы «Лістападзіка», генеральны дырэктар кінастудыі «Таджыкфільм» Махмадсаід ШАХІЕН** адзначыў, што секцыя дзіцячага і юнацкага кіно складаная для журы:

— Асоба, творчасць пачынаюцца з дзяцінства. На фільмы мы будзем глядзець вачыма дзяцей. Хочацца, каб і дзеці, і падлеткі ўсвядомілі сябе, фарміравалі сябе, каб потым самі выбралі свой шлях.

Цырымонія адкрыцця прайшла 5 лістапада ў кінатэатры «Піянер». **Першы намеснік міністра культуры Валерый ГРАМАДА** падкрэсліў сугучнасць слогану фестывалю з Годам гістарычнай памяці:

— Глыбока сімвалічна, што слоган «Сапраўдныя каштоўнасці» кінафестывалю «Лістапад» вельмі сугучны з Годам гістарычнай памяці. Усе фільмы, якія гледачы ўбачаць у рамках дзіцячага кінафестывалю «Лістападзік», поўнасцю адпавядаюць гэтаму слогану. Будуць паказаны выдатныя работы кінематаграфістаў з Кітая, Канады, Турцыі, Расіі, Казахстана.



Падчас мерапрыемства для дзяцей выступілі спявак Тэа, а таксама дзіцячы шоу-тэатр «Хвілінка». Адкрыццё «Лістападзіка» адзначылася сусветнай прэм'ерай фільма «Чараўнікі» **рэжысёра Рэната ДАЎЛЕТ'ЯРАВА**. Стужка распавядае пра падлетка Арцёма, які знаходзіць у школьнай шафцы таямнічы пачак запалак. Аказваецца, запалкі выконваюць жаданні:

— У дзяцінстве я быў вельмі лянівы, нядбайны, пераламаў мільён запалак для таго, каб не хадзіць у звычайную і музычную школу. Я верыў у гэта як у бажаство: калі зламаецца запалка — нічога не буду рабіць. Ідэя ў падсвядомасці ляжала, потым мне прыйшла думка купіць правы на кнігу «Ішоў па горадзе чараўнік». Яна была створана на савецкі менталітэт, для савецкіх школьнікаў. Таму нам прыйшлося перарабіць сюжэт, — распавёў Рэнат Даўлет'яраў.

Фільмам-пераможцам «Лістападзіка» стала расійская стужка «Звон надзеі» рэжысёра Аляксандра Куляміна. Драма распавядае аб лёсе брата і сястры, якія страцілі сваіх бацькоў у авіякатастрофе.

**Арына КАРПОВІЧ,**
**фота Лізаветы ГОЛАД.**

## Усмешка, роздум, настальгія

5 лістапада ў мінскім кінатэатры «Беларусь» адбыўся сеанс анімацыі для дарослых. Пад агульнай назвай «З усмешкай» былі аб'яднаны 13 мультфільмаў аўтараў з розных краін.

— Усе адабраныя намі работы, нават дэбютныя, адразу пасля выхаду атрымлівалі прызы на розных фестывалях, таму гэта сапраўды добрае кіно, — паведаміў на сустрэчы з гледачамі **праграмны дырэктар конкурсу анімацыйнага кіно Канстанцін АНДРУШАЧКІН**. Ён распавёў пра фільмы і іх аўтараў, некаторыя з якіх прысутнічалі ў зале. Паказ пачаўся з беларускага мультфільма «Класікі і шахматы», пра які шмат разоў сёлета пісалася і гаварылася, бо яго героі — Янка Купала і Якуб Колас.

— Фільм прысвечаны знакавай падзеі — 140-годдзю нашых вялікіх класікаў, — расказала стваральніца стужкі **рэжысёр Наталля КАСЦЮЧЭНКА**. — Мы пастараліся пазбегнуць фармальнага падыходу, падаць паэзію нашых класікаў і іх постаці ў незвычайным, лёгкім, ненавязлівым стылі, які быў бы зразумелы і школьнікам, і дарослым. Музыку выбралі не менш маштабную і значную — беларускага кампазітара Валерыя Іванова.

Колас і Купала сапраўды пададзены незвычайна... Учынілі паэтычны батл, з'яднаны з гульнёй у шахматы. Вакол — сучасныя беларускія дзеткі, якія спазнаюць дзівосы роднай прыроды пад радкі паэтаў, праўда, адцягваюць увагу гаджэты... Але куды дзенешся, калі сам Купала дае табе ў рукі замест смартфона падручнік па беларускай літаратуры...

Шматгранная, шматаблічная праграма дапамагае скласці ўяўленне пра асноўныя тэндэнцыі сучаснай анімацыі... Тэхналогіі дазваляюць любыя эксперыменты, могуць узнавіць віртуальную рэальнасць да драбніц... Ці не таму перавага сёння аддаецца эскізнасці, знарочыстай незавершанасці, «дзіцячасці» малюнка, сюррэалістычным, экспрэсіўным выдарысам, калі застаецца даволі месца для фантазіі, калі глядач — суразмоўца і нават сааўтар, які мусіць дадумваць, дамалёўваць убачанае на свой густ. Пра што былі стужкі? Хоць праграма называлася «З усмешкай», амаль ва ўсіх гучала размова пра адзіноту, пра супрацьстаянне чулага, творчага чалавека і фармальнага, прафаннага свету... Пра важнасць дабрыні, эмпатыі, пачуцця прыгожага...

Герой «Фантасмагорыі ў стылі мадэрн» расійскай рэжысёркі Аксаны Бранявіцкай, музыка з кантрабасам на спіне, пакутліва спрабуе ўзняцца на дах дома, дзе мусіць адбыцца канцэрт, але ліфт увесь час заняты людзьмі, паглынутымі побытавымі праблемамі... Лёс музыкі — граць перад пустымі крэсламі агням начнога горада. Французскі мультфільм «Таямніца месье Настока» Максіма Марыёна натхнёны кнігамі Патрыса Сэйлера пра гэткіх жа дзівакоў, якіх не разумеюць дзелавыя людзі, хоць тыя дзівакі шчасліўцаў свет сюрпрызамі... Французскі відэограф, аніматар-самавук Марыён стварае цэлы свет з фрагментаў старых механізмаў, анучак, фігурак «Лега»... Дзівакі і герой мультфільма Таццяны Акружной «Рэпетыцыя аркестра» (Расія): пад музыку Расіні валтарніст з маленькай дачкой спрабуе паспець на рэпетыцыю свайго аркестра, каб не разлаваць тырана-дырыжора...

Лаканічная стужка іранскага рэжысёра Ёнаса Газалі Кафашыяна «Людзі і месяц» змусіла гледачоў панасталгіраваць і праскнуцца філасофска-рамантычным настроем (а што, калі поўня — толькі чыёсьці вока, а наша жыццё — шлях у цягніку праз ноч?). Аніматар з Башкартастана Рым Шарафутзінаў у стужцы «Забіць дракона» нагадаў: гэта толькі здаецца, што, каб дасягнуць мэты, патрэбны моцная браня і зброя. Галоўнае — нязломны дух, які застаецца ў рыцара, нават пазбаўленага латаў. Сёстры-блізняткі Машковы з Расіі расчулілі чароўнымі «Прыступкамі», пра мніха з італьянскага манастыра і яго суседзяў. Калі вам цяжка ўявіць, як хор агуркоў спявае народную песню «Не для мяне» пад фанаграму хору Срэценскага манастыра, наважцеся на прагляд сюррэалістычнага мультфільма Івана Бандарэнкі (Расія). Дадам, што дзеянне адбываецца ў акружэнні грыбоў і грыбочкаў на фоне недасяжнага кахання... А фільм французскага рэжысёра Жульет Лаборы «Шкоднікі» адсылае да тэмы нецярпімасці і гвалту: восы з'ядаюць садавіну, дзеці б'юць вос, восы кусаюць дзяцей, дзеці спальваюць асінае гняздо, але гарыць і дрэва з пладамі...

Напэўна, нікому ўжо не трэба даводзіць, што анімацыйнае кіно можа раскрыць самыя сур'ёзныя тэмы і можа адрасавацца розным узростам... Асобныя сеансы праграмы анімацыйнага кіно «Лістапада» прысвечаныя мультфільмам пра вайну.

**Людміла ІВАНОВА.**

# ОАО «ГОМЕЛЬОБЛРЕКЛАМА» филиал «Эксперт-Услуга»

## (организатор аукциона) по поручению Гомельского филиала РУП почтовой связи «Белпочта» (продавец) извещает о проведении 28 ноября 2022 года открытого аукциона по продаже права на заключение договора аренды недвижимого имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование лотов | Начальная цена продажи, бел. руб., с учетом НДС (20 %) | Сумма задатка, бел. руб., с учетом НДС (20 %) |
|---|---|---|---|
| 1 | **Помещение площадью 122,8 (114,5;8,3) кв. м** в капитальном строении – здание отделения связи с инв. № 350/С-4458, помещения на 2-м этаже. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,3. Коэффициент месторасположения – 0,9. **Адрес:** г. Гомель, пр-т Октября, 81 | **518,83** | 518,83 |
| **Сведения о продавце** | Гомельский филиал РУП «Белпочта», г. Гомель, ул. Советская, 8, тел. 8 (0232) 79-69-76 | | |
| **Срок подачи заявления** | **С 08.11.2022 г. по 24.11.2022 г.** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга». Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения | | |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с BY35 AKBB 3012 0210 2005 4310 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY2X, УНП 400395996, **получатель – Гомельский филиал РУП почтовой связи «Белпочта»,** назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах за лот № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления) | | |
| **Условия пользования** | Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, организация производства (кроме вредных производств) | | |
| **Размер штрафа** | Лот № 1 – 5 (пять) базовых величин, согласно Указу Президента РБ от 10.01.2013 г. № 14 «О внесении изменений и дополнений в Указ Президента РБ от 05.05.2009 г. № 232» (Об определении размера штрафа в случае отказа или уклонения участника, выигравшего торги от условий проведения аукционных торгов, согласно действующего законодательства) | | |

**Срок договора аренды – 5 (пять) лет, шаг аукциона – 10 (десять) %. К участию допускаются индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица.**

